ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 33 (828) ● Чацвер, 18 лістапада 1971 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXV

ВЕСТКІ З МАТФАКА

Адбылося чарговае пасяджэнне камітэта камсамола факультэта. На ім заслуханы справаздачы сакратароў патокаў аб ходзе Ленінскага заліку.

***

Выйшаў першы нумар інфармацыйнага бюлетэня прэс-групы пры камітэце камсамола «Матэматычны факультэт за тыдзень». Ён расказвае аб задачах і ходзе II этапа Ленінскага заліку.

***

З раніцы ў камітэце камсамола шумна. Гучаць гітара, песні. Над нечым «пацеюць» у кутку мастакі. У чым справа? Хутка зноў запаліць агеньчык універсітэцкі клуб вясёлых і знаходлівых, і матэматыкі рыхтуюць сваю каманду. Мінулагодні капітан А. Зартайскі сакрэтаў раскрываць не хоча, але па ўсім відаць, што цікавых задум нямала. Таму фізікам — будучым праціўнікам — ёсць аб чым турбавацца.

Наш. кар.

АДБЫЛАСЯ XXIV СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНАЯ КАМСАМОЛЬСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ УНІВЕРСІТЭТА

ВЕДЫ, ЭНЕРГІЮ, ТВОРЧАСЦЬ — ТАБЕ, РАДЗІМА!

(З ДАКЛАДА САКРАТАРА КАМІТЭТА КАМСАМОЛА УНІВЕРСІТЭТА В. ПРАКОШЫНА)

Таварышы! XXIV з'езд КПСС заклікаў савецкую моладзь актыўна, творча ўдзельнічаць у выкананні грандыёзных планаў дзевятай пяцігодкі. А на Усесаюзным злёце студэнтаў, асабліва ў прамове Генеральнага сакратара ЦК КПСС тав. Л. І. Брэжнева, яскрава вызначана канкрэтная праграма дзеянняў для камуністаў і камсамольцаў вышэйшай школы, выказан пранікнёны наказ студэнцкаму юнацтву ў дарогу творчай, натхнёнай працы. Матэрыялы злёту канкрэтызавалі для нас рашэнні XXIV з'езда КПСС і XXVII з'езда КПБ, XVI з'езда ВЛКСМ і XXIV з'езда ЛКСМ Беларусі, якімі мы кіраваліся на працягу двух апошніх год, што аддзяляюць нас ад напярэдняй XXIII камсамольскай канферэнцыі універсітэта.

Дзейнасць камітэта камсамола, які дае сёння справаздачу, пачалася з інтэнсіўнага правядзення Ленінскага заліку, прысвечанага дастойнай сустрэчы 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна.

Са жніўня 1971 года пачаўся Усесаюзны Ленінскі залік «Рашэнні XXIV з'езда КПСС — у жыццё». Яго мэта — далейшае паляпшэнне камуністычнага выхавання студэнтаў-камсамольцаў, паспяховае рашэнне задач, пастаўленых партыяй перад камсамолам. Выкананне задач першага этапа супала з абмеркаваннем рашэнняў злёту студэнтаў у Крамлі, састаўленнем кожным камсамольцам на аснове гэтых рашэнняў асабістага комплекснага плана «Вучыцца камунізму». У камсамольскіх арганізацыях груп у асноўным прайшлі, а дзе-нідзе яшчэ праходзяць, камсамольскія сходы, якія разглядаюць гэтыя асабістыя планы і выпрацоўваюць групавыя планы, накіраваныя на забеспячэнне выдатнай і добрай вучобы студэнтаў, на прыцягненне іх да актыўнага ўдзелу ў грамадска-палітычным жыцці, да працы на карысць Радзімы. Камітэт камсамола надаваў і надае вялікае значэнне правядзенню першага этапа Ленінскіх залікаў — правільнай пастаноўцы задач перад кожным камсамольцам, перад кожнай групай, курсам, факультэтам.

Другі этап для нас супадае з асеннім вучэбным семестрам, з зімовай сесіяй. Яго вынікі мы будзем падводзіць у лютым. Трэба будзе разгледзець ход выканання асабістых і групавых планаў, унесці неабходныя карэктывы, асабліва па гарачых слядах сесіі, знайсці новыя сродкі паляпшэння паспяховасці, паляпшэння дысцыпліны, разгортвання студэнцкай навукова-даследчай работы, павышэння грамадска-палітычнай актыўнасці і г. д.

Трэці этап традыцыйна заканчваецца 22 красавіка—у дзень нараджэння У. І. Леніна. Ва ўсіх пярвічных камсамольскіх арганізацыях будзе праходзіць грамадская атэстацыя камсамольцаў. Рашэнне аб здачы Ленінскага заліку прымаюць камсамольскія сходы, улічваючы поспехі ў вучобе, ідэйна-тэарэтычную падрыхтоўку, грамадска-палітычную актыўнасць, маральны воблік камсамольцаў - студэнт а ў. Кожны павінен даць справаздачу, як ён выканаў асабісты комплексны план, як ажыццяўляе рашэнні XXIV з'езда КПСС, XVI з'езда ВЛКСМ, як вучыцца, які ўдзел прымае ў грамадскай рабоце, як рыхтуе сябе да абароны Радзімы, займаецца фізкультурай і спортам, навукова-тэхнічнай і мастацкай творчасцю. Для кіраўніцтва і аказання дапамогі ўдзельнікам Ленінскага заліку трэба ўжо цяпер, абавязкова цяпер, стварыць атэстацыйныя камісіі з удзелам выкладчыкаў, камуністаў, камсамольскіх актывістаў, ветэранаў партыі і камсамола. Іх задача — не толькі правесці працэдуру заліку, але і дапамагчы кожнаму паставіць перад сабой задачы, дапамагчы іх выканаць. Вопыт такой работы ў нас ёсць. Трэба яго выкарыстаць з улікам маючых месца памылак, няўдач, з выкарыстаннем поспехаў.

Выконваючы рашэнні XVI з'езда ВЛКСМ аб павышэнні ролі вузаўскага камсамола ў справе падрыхтоўкі маладых спецыялістаў, мы ўдзялялі вялікую ўвагу рабоце сектараў вучэбнай і навуковай работы (адказны член бюро А. Калымага). Пры гэтым камітэт камсамола сканцэнтраваў увагу на трох асноўных напрамках сваёй дзейнасці:

— вучэбна-выхаваўчая работа ў камсамольскіх арганізацыях БДУ;

— арганізацыя навуковай работы студэнтаў;

— работа па новаму прыёму ва універсітэт.

Пытанні акадэмічнай работы неаднаразова заслухоўваліся на пленумах і пасяджэннях бюро камітэта камсамола БДУ. Мы лічым, што фарміраванне ў студэнтаў высокай адказнасці за авалоданне ведамі з'яўляецца важнейшай задачай кожнай камсамольскай арганізацыі. Камітэт камсамола БДУ патрабаваў ад факультэцкіх камітэтаў шырока выкарыстоўваць статутныя патрабаванні да члена ВЛКСМ. Многія камітэты камсамола (асабліва на фізфаку, філфаку, гістфаку, факультэце прыкладной матэматыкі) працавалі ў напрамку гэтых патрабаванняў. Але належнай патрабавальнасці ў гэтым пытанні пакуль не праяўляюць курсавыя (паточныя) і групавыя бюро.

Акадэмічныя сектары камітэта камсамола БДУ і факультэтаў вялікую ўвагу ўдзялялі дысцыпліне студэнтаў. У справаздачны перыяд узрасло наведванне заняткаў, асабліва на матэматычным, хімічным, геаграфічным факультэтах.

Асаблівую ўвагу акадэмічныя камісіі факультэтаў удзялялі паспяховасці. Ва ўсіх групах праводзіліся камсамольскія сходы на гэту тэму. Паспяховасць была першым крытэрыем у ходзе выканання Ленінскіх залікаў. Праводзіліся праверкі і абмяркоўваліся іх вынікі. Гэта дапамагло выявіць патэнцыяльных запазычнікаў, выясніць прычыны іх дрэннай паспяховасці, калі было неабходна, прапаноўвалася дапамога. У тых выпадках, калі аб'ектыўных прычын не знаходзілася, прымяняліся і камсамольскія спагнанні. У гэтым навучальным годзе паспяховасць студэнтаў універсітэта склала 91,6 працэнта. Колькасць двоечнікаў-«хвасцістаў» паменшылася, але ўсё яшчэ складае 613, з іх 600 членаў ВЛКСМ. Вось у каго трэба фарміраваць адказныя адносіны да вучобы!

Некалькі павялічылася за гэты час колькасць студэнтаў, якія займаюцца на добра і выдатна — цяпер такіх студэнтаў 4.878, або 55 працэнтаў. Гэта наша апора ва ўсіх справах, гэта ў абсалютнай большасці сваёй камсамольскі актыў. Параўнальна нямнога студэнтаў (253 чалавекі) займаюцца толькі на здавальняюча. Гэтыя людзі, якія прытрымліваюцца звышмінімальных затрат нервовай і разумовай энергіі, па свайму ўзроўню амаль не адрозніваюцца ад «хвасцістаў». Але яны выходзяць з-пад кантролю і патрабавальнасці камсамольскіх арганізацый, знаходзячыся нібы ў цяню. І ўжо зусім вальготна жывуць у нас 2.895 студэнтаў, якія маюць так званыя змешаныя ацэнкі. Яны большменш застрахаваны ад поўнага правалу, а ў выдатнікі і актывісты не імкнуцца. А іменна ў падняцці асабістай адказнасці за атрыманне вялікіх, трывалых ведаў гэтай катэгорыяй студэнтаў хаваюцца рэзервы ўздыму паспяховасці і грамадскай актыўнасці ў нашай арганізацыі. Задача заключаецца ў тым, каб натхніць гэтых людзей прагай ведаў, прагай творчасці, імкненнем дагнаць лепшых у вучобе і грамадскай актыўнасці. Каб дапамагчы ім у гэтым, камітэт камсамола імкнецца рознымі спосабамі заахвочваць студэнтаў, якія праяўляюць высокую адказнасць у вучобе. З гэтай мэтай у справаздачны перыяд ва універсітэце былі праведзены два злёты студэнтаў-выдатнікаў. Ужо на першым з іх у сакавіку 1970 года было прынята палажэнне аб студэнтах-выдатніках, у якім

(Працяг на 2-й стар.)

Лекцыю па зарубежнай літаратуры для студэнтаў пятага курса гістарычнага факультэта чытае дацэнт Барыс Паўлавіч **Міцкевіч.**

Фота **Д. Чаховіча.**

ГОСЦІ СТУДЭНТАЎ

У дні работы з'езда журналістаў Беларусі студэнты запрасілі да сябе групу яго ўдзельнікаў. Шмат цікавага пачулі будучыя журналісты ад сваіх старэйшых калег. Прыемна было рэдактару слуцкай раённай газеты В. М. Макарэні ўбачыць у аўдыторыі тых, хто пачынаў шлях у журналістыку з райгазеты «Шлях Ільіча». Яшчэ школьнікамі сюды прыходзілі Георгій Чыгір, Ніна Пятруша, Надзея Жугіна. Яны скончылі школу рабселькораў пры гэтай газеце і зараз займаюцца на журфаку. Вучэбную практыку яны таксама праходзілі ў слуцкай раённай газеце. Валянцін Мікалаевіч у сваім выступленні звярнуў асаблівую ўвагу на сувязь студэнтаў журфака з газетай, у прыватнасці з раёнкай.

— І пасля заканчэння БДУ не спяшайцеся ў вялікую прэсу, ідзіце ў раёнку, паспрабуйце спачатку гэтага хлеба, а потым, калі вы знойдзеце сябе ў журналістыцы, можна пісаць і для больш шырокага кола чытачоў,— падкрэсліў у заключэнне В. М. Макарэня.

У выступленні Б. М. Пернікава, рэдактара маладзечанскай аб'яднанай газеты «Святло камунізму», галоўным было пытанне аб спецыялізацыі журналіста. Цяперашні час абавязвае журналіста быць у курсе ўсіх спраў, але вельмі важна, каб аўтар артыкула на тую ці іншую тэму сам добра разбіраўся ў той галіне, пра якую ён піша. Б. М. Пернікаў удзяліў увагу навуковай арганізацыі працы журналістаў. Для прыкладу прывёў паездку ў рэдакцыі раённых газет Эстоніі, дзе створана шмат новага для найлепшай працы журналістаў.

Дваццаць пяць год працуе на журналісцкай ніве Г. Я. Барысаў, рэдактар быхаўскай раённай газеты. Працу ў раёнцы ён лічыць важнай і адказнай, таму што тут журналісты найбольш цесна звязаны з людзьмі, аб якіх пішуць.

Амаль усе раённыя газеты нашай рэспублікі выходзяць на беларускай мове, і запатрабаванні рэдакцый да журналістаў — добра ведаць беларускую мову. В. П. Праскураў, рэдактар ганцавіцкай райгазеты «Савецкае Палессе», падкрэсліў гэтую акалічнасць і заклікаў студэнтаў удзяляць больш увагі роднай мове.

— Універсітэт вам дасць шмат ведаў, неабходных журналісту, але на працягу 5 год вучобы вы павінны выпрацаваць свой журналісцкі стыль, каб аператыўна, умела і проста перадаваць факты рэчаіснасці ў газеце,— дадаў Васіль Піліпавіч.

Сустрэча закончана. Яшчэ больш сяброў стала ў студэнтаў. Шчыра дзякавалі яны за дзелавыя парады, дамаўляліся аб сустрэчах ужо ў рэдакцыях у час практыкі.

У. СУБАТ,
студэнт.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

24 лістапада а 16-й гадзіне ў аўдыторыі 206 (галоўны корпус) пачне работу універсітэцкая справаздачна-выбарная канферэнцыя па народнаму кантролю.

Рэгістрацыя дэлегатаў — за 30 мінут да пачатку канферэнцыі.

ВЕДЫ, ЭНЕРГІЮ, ТВОРЧАСЦЬ—

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.).

вызначаны іх абавязкі і правы. Іх абавязкі не адрозніваюцца ад тых, якія запісаны ў Статуце ВЛКСМ і выказаны на крамлёўскім злёце студэнтаў. У правы ўваходзіць і прадастаўленне магчымасці свабоднага наведвання заняткаў, і выбар месца практыкі, і перавагі пры размеркаванні на работу, пры атрыманні літаратуры ў бібліятэцы, наладжванні прыбораў у майстэрнях, атрыманні пуцёвак у дамы адпачынку і прафілакторый, месцы ў інтэрнаце, наведванні агульнаўніверсітэцкіх мерапрыемстваў і г. д. Быў створан савет выдатнікаў універсітэта, які здзейсніў пэўную работу. Нас асабліва радуе тое, што выдатнікаў становіцца ўсё больш: на першым злёце іх было 925, а цяпер 1.287. Гэта вынік і ўвагі да выдатнікаў, і правядзення Ленінскіх залікаў. Стала больш і імянных стыпендыятаў, цяпер іх 17.

Чацвёра нашых студэнтаў былі ўдзельнікамі Усесаюзнага злёту: Давыдзенка, Жук, Стакроцкі і Балашчанка. Яны дастойна прадстаўлялі нашу арганізацыю ў Маскве, а цяпер іх выступленні гучаць у групах, на курсах, па радыё і тэлебачанні, публікуюцца ў газетах.

Вялікую работу праводзіць камітэт камсамола па падрыхтоўцы новага студэнцкага папаўнення, па прафесіянальнай арыентацыі будучых студэнтаў.

Яскравым паказчыкам актыўнасці студэнцтва, яго творчых здольнасцей, канкрэтнага ўвасаблення запавету Леніна аб тым, каб арганічна спалучаць вучобу са стваральнай працай, з'яўляецца студэнцкая навуковая творчасць. Даследаванні паказваюць, што абсалютная паспяховасць тых, хто займаецца навукова-даследчай работай, на 20—30 працэнтаў вышэй паспяховасці астатняй масы студэнтаў. Эфектыўнасць і плённасць навуковых даследаванняў праяўляецца і ў другім факце: яны ўсё ў большай меры атрымліваюць прамы выхад у практыку і тым самым садзейнічаюць фарміраванню адказнасці студэнтаў перад народнай гаспадаркай за якасць сваіх навуковых распрацовак.

У цяперашні час каля 3 тысяч членаў СНТ БДУ аб'яднаны ў 80 гуртках і семінарах, працуе творчае аб'яднанне маладых паэтаў і празаікаў «Узлёт», студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя, у 1971 годзе арганізаван і цяпер паспяхова працуе студэнцкі вылічальны цэнтр. Акрамя таго, многія члены СНТ працуюць індывідуальна пад кіраўніцтвам навуковых супрацоўнікаў і выкладчыкаў. Толькі за справаздачныя гады па выніках навуковых даследаванняў члены СНТ апублікавалі самастойна і ў сааўтарстве 190 работ у навуковых выданнях. Больш 200 студэнтаў выступілі на ўсесаюзных міжвузаўскіх і вузаўскіх студэнцкіх навуковых канферэнцыях у розных універсітэтах і інстытутах краіны. Толькі за мінулы навучальны год 245 студэнтаў за поспехі ў навукова-даследчай рабоце былі адзначаны медалямі, прэміямі, прызавымі месцамі, граматамі і падзякамі ЦК ВЛКСМ і ЛКСМБ, МВ і ССА СССР і БССР, Белсаўпрофа, БРС СНТ.

Нашы студэнты ўдзельнічаюць амаль ва ўсіх праводзімых выстаўках, экскурсіях, аглядах. Высокую ацэнку атрымалі 5 прыбораў, распрацаваных і зробленых пры непасрэдным удзеле нашых студэнтаў. Студэнты-фізікі прымалі ўдзел у стварэнні прыбораў, атрымаўшых залаты, сярэбраны і бронзавы медалі ВДНХ СССР. У 1965 годзе ва універсітэце была створана студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя. Роля і значэнне гэтай лабараторыі сталі асабліва прыкметны ў апошнія гады.

Аб удзеле студэнтаў у навукова-даследчай рабоце кафедр і лабараторый гаворыць і такі факт: у 40 з 60 тэм, выкананых універсітэтам па гаспадарчых дагаворах, прымаюць непасрэдны ўдзел студэнты.

Вельмі часта нас радуюць вынікі ўсесаюзных і рэспубліканскіх конкурсаў, і работ на іх прадстаўляецца ўсё больш, вышэй іх ацэнка (I і II катэгорыі). Параўнаем лічбы: 1969 г.—227 работ (97—I, 129—II, 47—III); 1970 г. — 436 работ (142—I, 200—II, 77—III).

Два гады запар I месца, а з ім Ганаровую грамату і прыз «Навука» атрымлівае наш універсітэт. Вялікая заслуга ў гэтым нашых камсамольскіх актывістаў-арганізатараў НДРС Д. Саковіча, У. Мікуловіча, Я. Ціткова, А. Верашчагіна і іншых. Лепш за іншыя працавалі арганізацыі СНТ на хімфаку, фізфаку, гістфаку, філфаку. Камітэты камсамола астатніх факультэтаў вельмі мала цікавяцца работай СНТ, не зразумелі яшчэ, што гэта іх кроўная справа, а ў асобных камітэтах толькі пад моцным націскам камітэта камсамола БДУ выдзелілі адказных за гэтыя ўчасткі работы.

Вялікая роля ў развіцці студэнцкай навуковай работы павінна належаць маладым вучоным-камсамольцам. На гэта мы арыентавалі камсамольскае бюро супрацоўнікаў фізфака, матфака, хімфака. Так, на фізфаку кожны камсамолец — навуковы работнік або выкладчык—мае пастаяннае камсамольскае даручэнне — кіраўніцтва некалькімі студэнтамі. Пры камітэце камсамола і рэктараце працуе савет маладых вучоных. Цяпер у ім энергічна працуюць маладыя, але ўжо сказаўшыя сваё слова ў навуцы выкладчыкі, супрацоўнікі і аспіранты. Іх узначальвае кандыдат хімічных навук І. І. Пакроўскі.

Уключыўшыся ва ўсенародны рух за выкананне рашэнняў XXIV з'езда КПСС, нашы студэнты ўнеслі непасрэдны ўклад у будаўніцтва, асабліва сельскае. Толькі ў працоўным семестры 1971 года, прысвечаным 50-годдзю БДУ, прынялі ўдзел 1.672 студэнты, з іх 33 прадстаўнікі В'етнама. Нашы студэнты працавалі ў Мінскай вобласці, горадзе Мінску, Гомельскай вобласці, Уральскай вобласці і горадзе Джамбуле Казахскай ССР, у Комі АССР, на рэстаўрацыі ў Брэсцкай крэпасці, у горадзе Іене ў ГДР. 63 лінейнымі атрадамі асвоена 2.935.500 рублёў капіталаўкладанняў.

Праца студэнтаў, арганізаваная на прынцыпах самакіравання, строгай дысцыпліны і высокай адказнасці кожнага члена атрада за агульны стан спраў, спалучалася з вялікай грамадска-палітычнай і культурна-масавай работай сярод насельніцтва і рабочых калектываў будоўляў. Байцамі атрадаў было прачытана 567 лекцый, дадзена 138 канцэртаў. Пры атрадах працавала 28 піянерскіх лагераў-спадарожнікаў.

Заслугоўвае станоўчай ацэнкі работа па падрыхтоўцы да працоўнага семестра, праведзеная камітэтамі камсамола гістарычнага і факультэта прыкладной матэматыкі.

Важнае месца ў дзейнасці камітэта камсамола займае спартыўная работа. Кафедрай фізічнага выхавання і спорту, спартыўным клубам пры дапамозе камітэта камсамола была праведзена XXVIII круглагадавая спартакіяда па 22 відах спорту. Акрамя гэтага, быў праведзен шэраг масавых асабіста-камандных спаборніцтваў. У 1970-71 навучальным годзе 6 студэнтаў сталі майстрамі спорту, 11 — кандыдатамі ў майстры, 63 чалавекі — першаразраднікамі. Чэмпіёнам V спартакіяды БССР стаў студэнт 2 курса фізфака Уладзімір Зялёнка (настольны тэніс). Юрый Глыбоўскі, студэнт 3 курса гістфака, устанавіў новы рэкорд БССР у скачках з шастом. Студэнт матфака А. Гантварг стаў чэмпіёнам Еўропы па міжнародных шашках.

На жаль, сувязь камітэта камсамола універсітэта са спартыўным клубам і кафедрай фізвыхавання не была дастаткова цеснай і не па віне кафедры і спортклуба. Г. Чапурны, адказны за спартыўную работу ў камітэце камсамола, не праяўляў актыўнасці, а бюро камітэта камсамола спакойна і цярпліва адносілася да гэтага.

У сваёй паўсядзённай рабоце камітэт камсамола выкарыстоўваў старонкі свайго органа — шматтыражкі «Беларускі універсітэт». Публікаваліся важнейшыя пастановы, умовы конкурсаў, публікаваліся матэрыялы сходаў, нарад, пленумаў і бюро. Нярэдка выступалі ў газеце камсамольскія работнікі і актывісты. Але мы не змаглі стварыць пастаяннага прэс-цэнтра ў камітэце камсамола, які б планамерна, усебакова асвятляў камсамольскае жыццё універсітэта ў шматтыражцы. Такія спробы настойліва рабіліся, але ні Свірко, ні Тулбусаў — нашы члены камітэта, студэнты журфака, якім даручалася гэтая важная справа, — не справіліся з ёй поўнасцю. У выніку ў нашым органе некалькі раз з'яўляліся матэрыялы з камсамольскага жыцця часам некампетэнтныя, часам недакладныя.

Камітэт камсамола БДУ заўсёды імкнуўся да таго, каб ідэалагічная работа паўней улічвала інтарэсы і запатрабаванні моладзі, садзейнічала фарміраванню марксісцка-ленінскага светапогляду, высокіх маральных якасцей.

Рэгулярна сумесна з выкладчыкамі кафедр грамадскіх навук праходзяць нарады камсамольскага актыву, на якіх абмяркоўваюцца пытанні вывучэння сацыяльна-эканамічных дысцыплін. Камітэты камсамола факультэтаў пастаянна разглядаюць пытанні наведвання заняткаў па сацыяльна-эканамічных дысцыплінах, актыўнасці камсамольцаў на семінарскіх занятках. За справаздачныя гады ва універсітэце значна вырас інтарэс студэнтаў да грамадскіх навук, палепшылася іх паспяховасць.

Новаму камітэту камсамола універсітэта ў сваёй рабоце трэба ўстанавіць яшчэ больш цесныя паўсядзённыя кантакты з усімі кафедрамі сацыяльна-эканамічных дысцыплін. Бо вопыт паказвае, што выдатныя і добрыя паказчыкі ў вучобе, як правіла, дасягаюцца там, дзе выкладчыкі грамадскіх дысцыплін і камсамольскі актыў працуюць сумесна.

Адной з галоўных задач ідэалагічнай работы было правядзенне Ленінскага заліку. Зараз Ленінскі залік праходзіць ужо ў трэці раз. На большасці факультэтаў Ленінскі залік прайшоў вельмі арганізавана. Камітэтамі камсамола філалагічнага, фізічнага, гістарычнага факультэтаў была здзейснена вельмі вялікая работа. Значна горш абстаяць справы на юрыдычным факультэце.

У фізікаў, напрыклад, ход выканання сацыялістычных абавязацельстваў па Ленінскаму заліку неаднаразова абмяркоўваўся на пасяджэннях камітэта камсамола факультэта, паточных бюро, сходах камсамольскіх арганізацый груп. Ленінскаму заліку быў прысвечан выпуск факультэцкай газеты «За навуку» і выпуск паточных газет. Вялікую дапамогу камітэту камсамола факультэта аказалі камуністы тт. Герман, Прылепка, Салаў і многія іншыя.

Добра праходзілі Ленінскія ўрокі на геаграфічным факультэце. Напрыклад, першакурснікі рыхтаваліся сур'ёзна і старанна. З дапамогай выкладчыкаў В. А. Барушка і Н. П. Хрыпко былі распрацаваны планы ўрокаў. Вялікую дапамогу аказала кафедра эканамічнай геаграфіі СССР, выкладчыкі якой прысутнічалі на Ленінскіх уроках у групах. Вялікую дапамогу ў правядзенні Ленінскіх урокаў аказвае камітэту камсамола дэлегат III з'езда РКСМ Яўген Сцяпанавіч Балакін.

Зараз у камсамольскай арганізацыі БДУ закончыўся I этап Усесаюзнага Ленінскага заліку «Рашэнні XXIV з'езда КПСС—у жыццё»!

Вялікае значэнне для ідэйна-палітычнага выхавання студэнтаў мае правядзенне тэарэтычных канферэнцый па грамадскіх навуках і палітінфармацыі. Сярод прыродазнаўчых факультэтаў выдзяляецца ў гэтых адносінах фізічны факультэт. Тут многія студэнты выступілі з дакладамі на палітычныя і ваенна-патрыятычныя тэмы. На матэматычным факультэце было напісана каля 200 дакладаў і рэфератаў па грамадскіх навуках, 26 дакладаў па сацыяльна-эканамічных дысцыплінах было зроблена на тэарэтычнай канферэнцыі факультэта прыкладной матэматыкі. На гуманітарных факультэтах такіх канферэнцый праводзіцца яшчэ больш.

На высокім узроўні праходзілі палітінфармацыі на гістарычным і біялагічным факультэтах. Напрыклад, на гістарычным факультэце час правядзення палітінфармацыі быў унесен у расклад. Для гэтага быў выдзелен адзін дзень у тыдзень, палітінфармацыі праводзіліся заўсёды ў адзін і той жа час. Тут праявілася добрае ўзаемадзеянне камітэта камсамола і партбюро.

Цікава праходзяць палітінфармацыі на біялагічным факультэце. Яны праводзяцца ў групах як выкладчыкамі, так і студэнтамі пад кіраўніцтвам куратараў.

А вось у асобных групах матэматычнага факультэта на малодшых курсах палітінфармацыі праходзілі парой нерэгулярна, фармальна, зводзіліся да бессістэмнай перадачы фактаў. Не было строгай сістэмы ў правядзенні палітінфармацый на ФПМ. На фізічным факультэце гэтае пытанне застаецца толькі часткова вырашаным.

Камсамольская арганізацыя універсітэта за справаздачны перыяд здзейсніла вялікую шэфскую работу. У маі 1971 года быў арганізаван камітэтам камсамола універсітэта, кафедрай гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў агітпрабег па рэспубліцы ў гонар 50-годдзя БДУ. Выкладчыкі і студэнты прачыталі больш 100 лекцый, далі 12 канцэртаў.

У ходзе выканання пастановы ЦК ВЛКСМ «Камсамол—сельскай школе» агітбрыгады факультэтаў выязджалі ў сёлы, дзе выступалі з канцэртамі, чыталі лекцыі, знаёміліся з жыццём сяла. За гэты час студэнты прачыталі больш 500 лекцый па самай разнастайнай тэматыцы, далі каля 100 канцэртаў.

Філолагі, напрыклад, у адной са школ Стаўбцоўскага раёна правялі вечар дзесяцікласнікаў, перадалі школе бібліятэку. Гісторыкі ў Засульскай сярэдняй школе Стаўбцоўскага раёна арганізавалі і вялі гурток «Наш Ленінскі камсамол», дапамаглі аформіць піянерскі пакой, арганізавалі цыкл лекцый па эстэтыцы. Надавалі вялікае значэнне шэфскай рабоце на ФПМ. У падшэфнай школе матэматыкаў 14 чалавек працавалі важатымі. Нямала цікавых спраў у актыве шэфскага сектара хімічнага факультэта.

Можна было б зрабіць значна больш, калі б не было цяжкасцей з транспартам. Новаму камітэту камсамола універсітэта неабходна будзе рашыць гэтае пытанне сумесна з адміністрацыйна-гаспадарчай часткай універсітэта.

Гэта вялікая шэфская работа садзейнічае падрыхтоўцы сучаснага спецыяліста-арганізатара, кіраўніка калектыву, выхавацеля мас. Гэтай жа мэце служыць дзейнасць факультэта грамадскіх прафесій, які ўжо мае 794 выпускнікі.

У адпаведнасці з рэкамендацыямі XVI з'езда ВЛКСМ па прапанове камітэта камсамола рэктарыят і партком прынялі рашэнне аб увядзенні грамадска-палітычнага практыкума, залік па якому павінны здаваць усе студэнты на грамадскіх кафедрах. Камітэту камсамола неабходна ў гэтым годзе сумесна з кафедрамі грамадскіх навук пачаць ажыццяўленне гэтага рашэння.

Камітэт камсамола накапіў значны вопыт выхавання студэнтаў на рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях савецкага народа, рабочага класа, Камуністычнай партыі.

Выхаванне патрыятызму ў студэнтаў, іх гатоўнасці да абароны Радзімы — адна з галоўных задач у ідэалагічнай рабоце. Праведзена многа розных мерапрыемстваў, і наша арганізацыя па праву—адна з лепшых сярод вну.

Адной з важнейшых частак усёй ідэйна-палітычнай і выхаваўчай работы камітэта камсамола з'яўляецца інтэрнацыянальная работа. Ва універсітэце вучацца прадстаўнікі многіх нацыянальнасцей СССР. Інтэрнацыянальнае выхаванне савецкіх студэнтаў з'яўляецца адным з галоўных напрамкаў інтэрнацыянальнай работы камітэта камсамола і здзяйсняецца ў цеснай сувязі з кафедрамі грамадскіх навук. Асаблівая ўвага ў практычнай рабоце ўдзяляецца як маштабным мерапрыемствам (мітынгі салідарнасці, інтэрнацыянальныя вечары, тэматычныя канферэнцыі, суботнікі і нядзельнікі), так і курсавым, групавым.

Рэгулярна выходзіць насценгазета «Дружба народаў» — орган савета дружбы універсітэта. Замежныя студэнты актыўна далучаюцца да грамадска-палітычнай, культурна-масавай, спартыўнай дзейнасці. Прыемным вынікам работы па дастойнай сустрэчы 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна быў удзел студэнтаў В'етнама, Лівана, Сірыі і іншых краін у здачы Ленінскага заліку, прычым падрыхтоўка іх была даволі высокай. Усе студэнты-інашаземцы прынялі актыўны ўдзел у ленінскіх суботніках. Новым у нашай рабоце з'явіўся ўдзел замежных студэнтаў у будаўнічых атрадах.

Камітэт камсамола працягвае развіваць сяброўскія сувязі з вну іншых краін: Іенскім і Гальскім універсітэтамі ў ГДР, Сафійскім універсітэтам у Балгарыі, Любляскім універсітэтам у Югаславіі. Толькі ў 1971 годзе 112 студэнтаў у складзе 10 груп выязджалі ў ГДР, Польшчу, Балгарыю.

У арганізацыйнай дзейнасці камітэта камсамола асноўная мэта, якую мы ставілі, — паляпшэнне ўнутрысаюзнай дысцыпліны. Аргсектар рэгулярна праводзіў праверкі стану ўнутрысаюзнай работы на факультэтах, многа ўвагі ўдзялялася ўдасканаленню планавання факультэцкіх, курсавых, групавых арганізацый, кантролю за выкананнем планаў работ, прынятых рашэнняў і пастаноў камітэта камсамола БДУ.

За справаздачны перыяд аргработа на факультэтах палепшылася. Варта выдзеліць факультэт прыкладной матэматыкі (сакратар М. Труш), фізфак (П. Кухарчык і Г. Стакроцкі), філфак (І. Рабчынская). На гэтых факультэтах у добрым стане ўся камсамольская дакументацыя, старанна складзены планы, факультэты рэгулярна здаюць узносы. Тут існуюць інфармацыйныя стэнды, на якіх пастаянна адлюстроўваецца работа камітэтаў камсамола. У іх добра наладжана сувязь з групамі, рэгулярна праходзіць вучоба камсамольскага актыву. Трэба адзначыць добрую сувязь з партарганізацыямі. Паляпшаецца аргработа на біяфаку, журфаку, юрфаку і геафаку. Сур'ёзнага ўмяшання камітэта камсамола БДУ патрабавала становішча спраў у камсамольскай арганізацыі геафака. Толькі пасля змены сакратара па прапанове бюро камітэта камсамола БДУ там з'явілася імкненне да зладжанай работы па ўсіх пытаннях.

Прадметам асаблівых клопатаў камітэта камсамола былі падбор камсамольскіх актывістаў і вучоба. На большасці факультэтаў гэтая вучоба была пастаўлена нядрэнна, горш іншых у гэтых адносінах выглядаюць журфак, біяфак, юрфак. Справаздачна - выбарная кампанія на факультэтах паказала, што ў цяперашні час у нас на выбарнай камсамольскай рабоце працуе многа цудоўных рабят, вопытных, дзелавых, гарачых, самаадданых, такіх, як Г. Стакроцкі і І. Рабчынская, М. Труш і В. Шкарупа, О. Мельнікаў і В. Раманаў, А. Волкаў і Л. Екель, А. Бутэвіч, А. Сабалеўская, С. Абуладзе і многія іншыя. На камсамольскай рабоце самааддана працуюць больш 60 камуністаў.

У справаздачны перыяд упершыню ў камітэце камсамола па вопыту МДУ была створана персанальная камісія, узначаліў яе член бюро Емяльяненкаў. За гэты час камісіяй праведзена 21 пасяджэнне, на якіх разгледжаны 133 персанальныя справы.

ТАБЕ, РАДЗІМА!

СВЯЦІЦЬ ЗАЎЖДЫ

І. ІГНАЦЕНКА, старшыня штаба «КП».

«Камсамольскі пражэктар» — найбольш дзейсная форма ўдзелу камсамольцаў і моладзі ў грамадскім кантролі, важным сродку ў рабоце камсамола па камуністычнаму выхаванню маладога пакалення. Ён разлічан на тое, каб развіваць у юнакоў і дзяўчат грамадскую актыўнасць, выхоўваць прынцыповасць, непрымірымасць да недахопаў, пачуццё асабістай адказнасці за справу калектыва і ўсяго грамадства. У штаб «КП» увайшло 12 чалавек, але далей гэтага справа не пайшла. Тлумачыцца гэта тым, што камітэт камсамола спачатку ўпусціў з віду гэты важны ўчастак камсамольскай работы і разгледзеў стан спраў у штабе «КП» толькі ў кастрычніку 1970 года. Было вырашана новы штаб не ствараць (па палажэнню ён выбіраецца толькі камсамольскай канферэнцыяй), а зрабіць упор на актывізацыю работы факультэцкіх штабаў і правядзенне вучобы «пражэктарыстаў».

Добра працавалі штабы фізічнага факультэта (старшыня В. Таранчук), гістарычнага (М. Часноўскі), філалагічнага (І. Усціновіч), журналістыкі (У. Трусаў).

Не зусім ладзілася ў першым семестры мінулага вучэбнага года работа ў штабах юрыдычнага, біялагічнага, геаграфічнага і хімічнага факультэтаў.

Не на ўсіх факультэтах належным быў кантакт з групамі і пастамі народнага кантролю, што, вядома, таксама адмоўна ўплывала на работу штабаў.

Ёсць сэнс асобна спыніцца на рабоце штаба «КП» фізічнага факультэта, якая, на наш погляд, заслугоўвае станоўчай адзнакі. Работу штаб пачаў з размеркавання абавязкаў паміж яго членамі. Створаны былі наступныя сектары: арганізацыйнай работы; галоснасці; быту; рэйдавая брыгада; рэдкалегіі.

Штаб правільна зразумеў, што галоўнае ў рабоце «пражэктарыстаў» не толькі выяўляць недахопы і парушэнні, а перш за ўсё змагацца за тое, каб іх не было.

У штаба быў цесны кантакт з партыйнай арганізацыяй факультэта і групай народнага кантролю.

Верыцца, што гэта не адзіны прыклад, што ў складзе штабаў і атрадаў «КП» будуць дзейнічаць баявыя, нецярпімыя да недахопаў і прынцыповыя камсамольцы, якія лозунг Маякоўскага «Свяціць заўжды, свяціць усюды» здзейсняць на самай справе.

СЯРЭДНІМІ БЫЦЬ НЕ ЗАХАЦЕЛІ

Н. ІЛЬЮШЫНА, дэлегат філфака

У мінулым годзе па выніках сацыялістычнага спаборніцтва наша група заняла першае месца. Ці толькі гэтага імкнуліся мы дабіцца? Вядома, не. Мы былі зацікаўлены ў тым, каб стварыць сапраўдны калектыў. Дружны, з'яднаны. Дапамагла нам у гэтым грамадская работа. Мы ўзялі шэфства над сярэдняй школай. Вырашылі сабраць бібліятэку, стварыць кабінет Я. Купалы, прывезці рабят ва універсітэт на экскурсію. Вырашылі і зрабілі. Шэфства над школай стала нашым групавым заданнем, якое мы павінны былі выканаць у ходзе Ленінскага заліку. І калі давялося даваць справаздачу, расказвалі не толькі аб выкананні сваіх асабістых абавязацельстваў, а і аб сваіх справах у школе. Нашай гордасцю на заліку быў бюст У. І. Леніна, падораны школьнікамі.

У гэтым годзе мы працягваем шэфства над нашай школай. Больш таго, усе групы курса атрымалі аналагічныя заданні. Мы хочам пабудаваць работу так, каб кожны камсамолец адчуваў, што наперадзе ў яго сапраўдны экзамен. Ні адзін камсамолец у нас не застаўся без даручэння. Кожны—у справе. Нам хочацца, каб Ленінскі залік гэтага года стаў сапраўдным аглядам камсамольскіх спраў, праверкай асабістай адказнасці.

СЛЕД НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ

Г. СТАКРОЦКІ, сакратар камітэта камсамола фізфака

Мне, дэлегату Усесаюзнага злёту студэнтаў, асабліва запомніліся вось гэтыя словы Леаніда Ільіча Брэжнева: «Кароткая студэнцкая пара—усяго пяць-шэсць год. А след яна пакідае на ўсё жыццё. Набытае за гэтыя гады — гэта тая ноша, якая, як кажуць, плеч не цягне. Наадварот, чым больш важкі багаж ведаў, культуры, грамадскіх звычак, тым больш упэўнена крочыць чалавек па жыцці».

Мне хочацца спыніцца на ўдзеле студэнтаў-фізікаў у навуковай рабоце. У цяперашні час навукова-даследчай работай займаецца амаль 800 студэнтаў нашага факультэта. Маладыя даследчыкі прымалі актыўны ўдзел у студэнцкіх навуковых канферэнцыях не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Пяць студэнтаў нашага факультэта былі ўдзельнікамі 17-й канферэнцыі вну рэспублік Прыбалтыкі, Беларусі і Калінінградскай вобласці ў Рызе. Першае месца на секцыі фізікі заняў студэнт 5 курса А. Давыдаў, чацвёртае і пятае — студэнты А. Нікановіч і А. Супрун. Ю. Плотнікаў заняў першае месца ў адной з падсекцый біялогіі.

Яшчэ два студэнты-фізікі прымалі ўдзел у канферэнцыі ў Петразаводскім універсітэце. 12 работ нашых студэнтаў прадстаўлены на Усесаюзным конкурсе-аглядзе. Гэтыя факты гавораць самі за сябе.

Праведзена значная работа па прапагандзе фізічнай навукі і фізічнага факультэта. У школах Мінскай вобласці прачытан шэраг лекцый, праведзены экскурсіі з навучэнцамі старэйшых класаў па лабараторыях фізічнага факультэта.

Дзякуючы ініцыятыве прафесара Ю. С. Багданава, на факультэце быў арганізаван факультатыўны курс лекцый па тэме «Абагульненыя функцыі», якія наведваюць 100 студэнтаў розных курсаў. На кафедры ЭММ дзейнічае студэнцкі вылічальны цэнтр.

Камсамольская арганізацыя разам з партыйным бюро факультэта ўдзяляе вялікую ўвагу выхаванню творчых адносін студэнтаў да вучобы, аказвае дапамогу ў арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу, прыцягвае студэнтаў да навукова-даследчай работы, праводзіць агляды, конкурсы. Адным словам, робіць усё магчымае, каб студэнцкія гады пакінулі ў жыцці кожнага глыбокі і незабыўны след.

ПРЫНЦЫПОВАСЦЬ І СПРАВЯДЛІВАСЦЬ

В. ЕМЯЛЬЯНЕНКАЎ, старшыня персанальнай камісіі

У першыя дні работы персанальнай камісіі мы сустрэліся з такой з'явай, як нясвоечасовы абмен камсамольскіх білетаў ці наогул іх страта. Выявілася, што ў асобных выпадках камсамольцы знарок не заяўлялі аб гэтым, маўляў, а раптам знойдзецца. Білет не знаходзіўся, так званыя «камсамольцы» як ні ў чым не бывала плацілі ўзносы, а камсоргі нават і ў думках не мелі, каб патрабаваць білет і паставіць адзнаку аб узносах. Так праходзіў часам год, пакуль нечаканы выпадак не адкрываў сапраўднае становішча.

Бывалі і такія выпадкі, калі персанальная справа таго ці іншага камсамольца разглядалася на камсамольскім сходзе групы, курса ці патока, выносілася адпаведнае рашэнне, і справа на гэтым канчалася. Сакратары забывалі перадаць персанальную справу на пасяджэнне камітэта камсамола факультэта.

А персанальныя справы камсамольцаў патрабуюць максімальнай увагі, і памятаць аб гэтым трэба заўсёды. Аднак і асобныя камітэты камсамола факультэтаў нясвоечасова перадаюць асабістыя справы ва універсітэцкі камітэт камсамола. Так, напрыклад, было выяўлена, што на хімфаку сабралася шмат персанальных спраў, якія даўно ўжо неабходна перадаць у камітэт камсамола універсітэта. Такая ж з'ява высветлілася і на біялагічным факультэце.

Даводзілася нам разглядаць персанальныя справы, звязаныя з амаральнымі паводзінамі. У большасці выпадкаў камсамольцы правільна ацэньваюць зробленыя ўчынкі, строга наказваюць вінаватых, але даводзілася сустракаць і выпадкі памылковага сяброўства.

Чуласць, увага, справядлівасць ніколі не павінны супярэчыць строгасці і прынцыповасці.

СПРАВА СУМЛЕННЯ І АБАВЯЗКУ

І. В. МАРЧАНКА, намеснік начальніка ваеннай кафедры, старшыня савета ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны

Я з радасцю прыняў запрашэнне выступіць на камсамольскай канферэнцыі. Для мяне, камсамольца 30-х гадоў, былога студэнта Беларускага дзяржаўнага універсітэта, гэта вялікі гонар.

З пачуццём сардэчнай удзячнасці сустрэлі прамову Л. І. Брэжнева на Усесаюзным злёце студэнтаў і мы, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, былыя студэнты, тыя, хто адклаў кнігі і канспекты ў грозныя гады вайны і ўзяў у рукі зброю, каб разам з усім народам стаць на абарону Радзімы.

Калектыў нашага універсітэта мае ў сваіх радах 360 ветэранаў вайны. Сярод іх тры Героі Савецкага Саюза, 14 чалавек узнагароджаны ордэнамі Леніна, 34—ордэнамі Чырвонага Сцяга, 101—ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступені, 164 — ордэнамі Чырвонай Зоркі.

Партыйнымі, камсамольскімі арганізацыямі універсітэта, ваеннай кафедрай, саветам ветэранаў зроблена нямала для паляпшэння ваенна-патрыятычнага выхавання студэнцкай моладзі. У 1970-71 навучальным годзе праведзена 29 тэматычных і абаронных вечароў, арганізавана 32 сустрэчы з Героямі Савецкага Саюза і ветэранамі працы, прачытана 516 лекцый па ваенна-патрыятычнай тэматыцы. Студэнты былі удзельнікамі 33 паходаў па месцах баявой і працоўнай славы, 36 спаборніцтваў па кулявой стральбе, у якіх прынялі ўдзел 1.866 чалавек.

Лепшымі па выніках спаборніцтва за першае паўгоддзе 1971 года аказаліся факультэты: фізічны, хімічны, геаграфічны і матэматычны. Гэтага нельга сказаць аб філалагічным, юрыдычным і прыкладной матэматыкі.

Усенародная любоўю акружаны ў нашай краіне патрыёты, мужна і стойка абараняўшыя свабоду і незалежнасць сацыялістычнай Радзімы. Камсамольскай арганізацыі універсітэта неабходна ўключыцца ў актыўны пошук матэрыялаў аб загінуўшых у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі выкладчыках і студэнтах, упісаць іх слаўныя імёны залатымі літарамі ў гісторыю нашага універсітэта. Неабходна таксама падрыхтаваць і выдаць кнігу аб слаўным подзвігу супрацоўнікаў універсітэта ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Гэта важная і ганаровая работа для нашых журналістаў, філолагаў, гісторыкаў. І гэту работу патрэбна пачаць ужо цяпер. Яна—справа нашага сумлення, гонару, абавязку.

БОЛЬШ САПРАЎДНЫХ СПРАЎ



А. КАНЕЎСКІ, дэлегат гістфака

Мне хочацца звярнуць увагу на той момант, што нават пры станоўчым палажэнні спраў у камсамольскіх арганізацыях, пры даволі значных поспехах відавочна, што гэта—вынік дзейнасці параўнаўча невялікай групы камсамольцаў-актывістаў. А вялікая частка камсамольцаў застаецца ў пасіве. Яе роля ў жыцці арганізацыі зусім нязначная. Іменна пасіўнасць, безадказнасць і з'яўляюцца найвялікшым злом і прычынай усіх недахопаў нашай работы.

Што можна канкрэтна зрабіць, каб ускалыхнуць гэту пасіўную масу? Я лічу, што рашаючая роля ў вырашэнні гэтай праблемы належыць камсоргам групавых арганізацый. Іменна ад іх добрасумленнасці і адказнасці ў адносінах да справы і залежыць павышэнне актыўнасці радавых камсамольцаў. Неабходна, каб курсавыя бюро, факультэцкія камітэты камсамола сканцэнтроўвалі сваю ўвагу на рабоце ў групах, каб былі не толькі кантралёрамі, але таксама арганізатарамі, нават памочнікамі групкамсоргаў.

І як мага менш размоў, паперак, больш спраў, сапраўдных, гарачых, камсамольскіх. Гэтаму вучыў і Уладзімір Ільіч Ленін.

ГОНАР І АДКАЗНАСЦЬ

П. ВАКУЛЬЧЫК, старшыня савета дружбы

З 22 краін свету займаюцца ў нашым універсітэце іншаземныя студэнты. Гэта вялікі гонар для універсітэта, а разам з тым — і адказнасць. Нас цікавіць, якія ўражанні аб нашай краіне прынясуць з сабой на далёкія землі іншаземныя студэнты. Мы імкнемся, каб гэтыя людзі як мага больш глыбока і поўна азнаёміліся з нашай сацыялістычнай краінай, каб яны змаглі ацаніць гасціннасць і шчырасць нашага народа і назаўсёды засталіся нашымі сябрамі. Вось чаму адной з галоўных задач усёй ідэйна-палітычнай і выхаваўчай работы камітэта камсамола універсітэта з'яўляецца інтэрнацыянальная работа. З мэтай стварэння адзінства ў рабоце камітэта камсамола універсітэта і зямляцтваў іншаземных студэнтаў быў створан савет дружбы, на рахунку якога нямала добрых спраў. Але сёння важней сказаць аб недахопах, якія даюць аб сабе ведаць.

Лектарская група пры савеце дружбы магла аказаць значную дапамогу універсітэцкаму аддзяленню таварыства «Веды». На жаль, гэтага не атрымалася.

Рэгулярна і на больш высокім узроўні патрэбна весці вучобу інтэрнацыянальнага актыву факультэтаў, якая праводзілася раней, як абмен вопытам. Але нават пры абмене вопытам хацелася б чуць свежыя, канкрэтныя прыклады з вопыту работы камсамольскіх арганізацый.

Шмат выпускалася інтэрнацыянальных насценных газет ва універсітэце, у інтэрнатах. Выпуск іх павінен весціся на больш высокім ідэйным і мастацкім узроўні. Тут маглі б аказаць нам неацэнную дапамогу студэнты-журналісты.

Някепска было б мець і мастацкую самадзейнасць. Такую, напрыклад, як у БПІ. Ва ўсякім разе сярод 350 іншаземных студэнтаў можна знайсці самыя разнастайныя таленты.

І, нарэшце, трэба больш увагі звярнуць на арганізацыю працоўнага семестра студэнтаў-іншаземцаў. Гэта ж сапраўды цудоўная і самая пераканаўчая школа жыцця і нашай рэчаіснасці.

***

На канферэнцыі таксама выступілі: сакратар ЦК камсамола Беларусі У. В. Грыгор'еў, прарэктар БДУ С. А. Умрэйка, дэлегаты А. Федарук, У. Расохін, М. Дрозд.

Новы састаў бюро камітэта камсамола універсітэта

1. Алег СЛУКА (сакратар камітэта камсамола).
2. Уладзімір КУЗЬМІНАЎ (намеснік сакратара па ідэалагічнай рабоце).
3. Уладзімір СІЛІН (намеснік сакратара па арграбоце).
4. Леанід ДАВЫДЗЕНКА (намеснік сакратара па вучэбнай і навуковай рабоце).
5. Рычард ЯНЧЫЛІК (намеснік сакратара па інтэррабоце).
6. Уладзімір АДАМУШКА.
7. Віктар АНІШЧЫК.
8. Мікалай ТРУШ.
9. Ірына РАБЧЫНСКАЯ.
10. Іна КАСТРЫЦА.
11. Анатоль ДЗЕДУШКІН.

Ідуць семінарскія заняткі па марксісцка-ленінскай філасофіі ў студэнтаў трэцяга курса фізічнага факультэта, якія праводзіць асістэнт Вольга Іларыёнаўна **Ігнаценка.** На пытанне «Сацыяльная структура грамадства» адказвае Вера **Сачыўка.**

Фота **Д. Чаховіча.**



ПА СТАРОНКАХ НАВУКОВАЙ ПЕРЫЁДЫКІ

АРЫГІНАЛЬНАЯ ТАРА

Мяккая тара для вадкасцей і парашкоў, якая спалучае ў сабе ўласцівасці металічнай і шкляной, выпускаецца фірмай «Гессэр Машыненфабрык» (Штутгарт, ФРГ), паведамляе Файнэншл таймс». У залежнасці ад запаўняемага прадукта корпус тары можа вырабляцца з некалькіх слаёў поліэтылену з кардонам і алюмініевай фальгой (напрыклад, для сокаў). Для захавання прадуктаў ад забруджвання парашком, які ўтвараецца пры кантакце вадкасці з алюмініевай фальгой на вострых краях матэрыялу, выкарыстоўваецца шчыльная стужка, якая прыпайваецца да кардону.

ПОШУКІ ПРАЦЯГВАЮЦЦА...

У пошуках сродкаў супраць рака сабрана і даследавана больш 350 тысяч розных узораў — ад сінтэтычных рэчываў да экстрактаў з насякомых і марскіх жывёл, гаворыцца ў тэлеграме Асашыэйтэд Прэс. З 17 тысяч рэчываў, якія праходзяць выпрабаванне ў цяперашні час, у 300 рэчываў выяўлены ўласцівасці, што даюць мэтазгоднасць рабіць далейшую праверку іх супрацьпухлінавай актыўнасці на жывёлах.

З РЭДАКЦЫЙНАЙ ПОШТЫ

САРДЭЧНАЕ ДЗЯКУЙ!

Цяжкае становішча стварылася ў домакіраўніцтве № 34 Цэнтральнага раёна. Неабходна было выканаць вялікую работу па падрыхтоўцы жылога фонду да зімы. Справіцца з гэтым нам самім аказалася не пад сілу. На выручку прыйшлі студэнты IV курса факультэта прыкладной матэматыкі. Асабліва добра папрацаваў атрад на чале з Міхаілам Дымковым. Прыклад у працы паказалі Мікалай Дарожка, Леанід Зіневіч, Уладзімір Вараўка, Раіса Куляшова, Ала Патапенка і іншыя. За некалькі гадзін працы яны прывялі ў парадак двор і падсобныя памяшканні ў доме № 17 па вуліцы Куйбышава.

Ад імя кіраўніцтва і прафсаюзнай арганізацыі домакіраўніцтва № 34 выказваем студэнтам сардэчнае дзякуй.

С. ЦУРКАН,
упраўляючы домакіраўніцтвам № 34.
Г. ВАЙЦЯХОВІЧ,
старшыня мясцкома.

СПОРТ

ПРАВЕРКА ПЕРАД ВЫПРАБАВАННЕМ

Некалькі дзён назад зборныя каманды універсітэта па валейболу вярнуліся пасля таварыскіх спаборніцтваў у Літве. Сяброўскія сустрэчы прайшлі ў двух гарадах: Каунасе і Іонава.

У першы дзень спаборніцтваў мужчынская зборная выйграла сустрэчу з камандай Каунаскай сельскагаспадарчай акадэміі (3:1). Аднак наступныя гульні былі менш удачнымі. На наступны дзень рабяты і дзяўчаты гулялі з сапернікамі з Каунаскага політэхнічнага інстытута. У вельмі цяжкай барацьбе дзяўчаты прайгралі з лікам 2:3 (14:16, 15:8, 15:3, 13:5, 8:15), а рабяты з лікам 0:3.

На трэці дзень спаборніцтваў каманды выехалі ў горад Іонава, размешчаны недалёка ад Каунаса, дзе сустракаліся са спартсменамі азотнатукавага камбіната «Азотас». Але і тут не пашанцавала. Дзве сустрэчы былі прайграны.

Прайшоўшыя спартыўныя паядынкі паказалі, наколькі каманды падрыхтаваны да будучых спаборніцтваў. Можна сказаць, што дзяўчаты гуляюць больш зладжана, упэўнена, але ім не хапае тэхнікі. Рабятам жа трэба яшчэ папрацаваць на трэніроўках, каб дабіцца поўнага разумення і сыгранасці ў камандзе.

Зараз каманды дома і прыступілі да трэніровак. Вельмі хутка ім прадстаяць новыя выпрабаванні — першынство ВНУ горада па валейболу. Пакуль ёсць час, трэба ўлічыць усе памылкі і зрывы, дапушчаныя ў таварыскіх сустрэчах, каб дабіцца поспеху ў афіцыйных спаборніцтвах.

Т. АЛЯКСЕЕВА.

НА РАЗДАРОЖЖЫ

ПЕРШЫ зборнік маладога аўтара бярэцца ў рукі з асцярогай. І тлумачыцца гэта тым, што часам добрыя нізкі вершаў, змешчаных у газетах і часопісах, сабраныя разам, не нясуць той згрунтаванай нагрузкі, якая павінна прысутнічаць у зборніку, не надаюць яму цэласнасці. Так здарылася з першай кніжачкай Нэлі Тулупавай. Вершы выразна распадаюцца на тры тэмы: медыцына, прырода, каханне.

Тое, што паэтэса нейкі час працавала фельчарам, наклала пэўны адбітак на асобныя творы (дарэчы, лепшыя ў гэтым зборніку). У іх адчуваецца трапятанне жывой душы, якая на ўсё жыццё захавала ў патаемных куточках пачуццё ўдзячнасці людзям, якія ў цяжкую хвіліну дапамагалі цёплым чалавечым словам ці проста парадай. Гэтыя вершы выспелі ў сэрцы, бы зярняты ў коласе, у іх адчуваецца ўменне хораша здзіўляцца добраму і светламу ў чалавеку і прыродзе, асцярожна зберагаць ўсё жывое і прыгожае. Сонечныя праменні ў Н. Тулупавай

Праз акно знадворку
зазірнулі,
Трапілі ў калыску да
дзіцяці,
Першым словам, казкаю
матулі
Засталіся жыць яны
хаце.
Азарылі круглы бохан
хлеба,
На скарынцы золатам
заззялі...

Паэтэса нічога не выдумляе — і таму вершы не выклікаюць сумнення. Напісаны яны шчыра, шырока і нясуць у сабе пэўную паэтычную нагрузку. У вершы усе яны нагадваюць толькі сыравіну, з якой паэтычны элемент яшчэ не вылучан.

Вельмі празаічна гучыць верш «На плошчы вечны гарыць агонь...». Тэма ў ім закранута важная, але, відаць, можна знайсці нейкія новыя моўныя сродкі, праз уласнае асэнсаванне ісці да творчых знаходак.

Мы верым, што пачуцці бярозы, якія «начапілі чорныя стужкі...». Але за ўсёй гэтай слоўна-метафарычнай эквілібрыстыкай не заўважаецца тых зярнятак сапраўднай вобразнасці, без якіх кожны верш — будзь ён героіка-паэтычным ці лірычным — не становіцца паэтычнай з'явай. Пачынаючы ўвогуле добра той ці іншы верш, Н. Тулупава збівае часам вельмі кепска? У вершы «Ты рукою пакратай...» ёсць такія дзве страфы:

Яе (бярозу.— В. Ш.)
прытапталі(?)
Боты салдатаў.
На хлеў калгасны —
Прыцэл аўтаматаў.
Не памогуць ні слёзы,
Ні словы аб помсце...
Сіраціна-бяроза
Гукі цёплыя помніць (?).

Па-першае, бярозу (ужо не маладзенькую, як гэта сведчыць верш) прытаптаць нельга, по-другое, якія гэта цёплыя гукі помніць яна? Зусім незразумела. Да таго ж, нават чалавек, які толькі пачынае займацца вершаскладаннем, не рызыкне цяпер ужываць такія штампы, як «салдатаў-аўтаматаў», «слёзы-бяроза» і інш. У некаторых творах Н. Тулупава збіваецца з рытму, што аніяк не садзейнічае музычнаму гучанню верша.

Перагарнуўшы апошнюю старонку зборніка, міжволі задумваешся: па якім жа шляху пойдзе далей паэтэса: па лёгкім — заспакоенасці і паблажлівасці да сябе самой — ці па цяжкім шляху — шляху вечнага пошуку. Наступная «станцыя» Н. Тулупавай дасць на гэта правільны адказ.

В. ШЫХАНЦОЎ.

«Сэрца» Н. Тулупава піша:

Я сягоння цябе праверыла,
Мне не сорамна ад
людзей,
Я сягоння ў цябе
паверыла,
Ты не здрадзіш, не
падвядзеш!

Вершы «Аганькі за вокнамі палаты...», «Не шукайце мяне...», сагрэтыя цёплым пачуццём, паказваюць удумлівасць, імкненне паэтэсы быць вернай жыццю ў дэталях, асэнсоўваць яго рух, заканамернасці. Гэтак жа добра гучаць вершы, стылізаваныя пад народныя песні, у прыватнасці «Песня пра партызанку» і «Кладка».

На жаль, такіх твораў у зборніку мала. А што датычыцца астатніх, дык амаль гераіні — шчырыя, але, на жаль, у многіх вершах прысутнічае толькі простая канстатацыя бытавога факту. А дзе ж аснова для роздуму, для перажыванняў, дзе палёт думкі, якая павінна весці за сабой чытачоў?

У асобных творах Н. Тулупавай лёгка заўважаецца задавальненне дробным, просценькім, што, натуральна, выклікае ў чытача ўражанне натуральнасці, наіўнасці. Атрымліваецца нешта накшталт замалёвак без сэнсу, без належнай унутранай сілы. Тут і «зялёная ў студзень і ў маі яліна», і мароз палахлівы, які «ад сонца ў рэчку залез», і лівень, які так напалохаў асіну, што «дагэтуль яна дрыжыць», і ваецца з вызначнай сцежкі, бо не бачыць розніцы паміж вычытаным і асабіста падгледжаным. Адсюль, відавочна, і бедалагі-журавы, якія з зайздраснай лёгкасцю пералятаюць у пачынаючых аўтараў з аднаго верша ў другі, набіваючы тым самым аскоміну нават у самых непатрабавальных чытачоў.

У кніжцы Н. Тулупавай часта сустракаюцца неахайныя словы і выразы. Кроў напаўняе «прасветы вен»(?), у другім вершы паэтэса ўсклікае: «Шчасцем засыплем (?) вочы!» Ёсць і такі радок: «Хтосьці плакаў наўзрыд, услых...». Навошта гэтае ўдакладненне: «услых»? Альбо ўся справа ў рыфме, з якой у Н. Тулупа-

ДЭКАДНІК БЯСПЕКІ РУХУ

З мэтай узмацнення ўвагі арганізацый, устаноў, прадпрыемстваў і ўсіх грамадзян да пытанняў бяспекі руху з 15 па 25 лістапада ў Савецкім Саюзе праводзіцца ўсесаюзны дэкаднік па барацьбе з аварыйнасцю на вуліцах горада і дарогах.

Становішча з аварыйнасцю ў горадзе Мінску за 10 месяцаў гэтага года выклікае сур'ёзную заклапочанасць, бо за гэты перыяд адбылося 523 дарожна-транспартныя здарэнні, пры якіх 39 чалавек загінула і 509 паранена.

Асабліва многа здарэнняў па віне пешаходаў, калі яны пераходзяць вуліцу ў неўстаноўленых месцах або перабягаюць дарогу перад блізка ідучым транспартам, з'яўляюцца на праезджай частцы ў нецвярозым стане.

Сярод парушальнікаў правіл руху нямала студэнтаў БДУ. Так, студэнтка І курса гістфака Ольга Качурко перабягала вуліцу Свярдлова па-за пешаходным пераходам, блізка ля машыны. Студэнтка І курса філфака Іна Мацкевіч на вуліцы Я. Коласа пры наяўнасці падземнага пераходу перасякала вуліцу ў забароненым месцы і стварыла аварыйную сітуацыю для аўтамашыны «Волга». І. Мацкевіч аштрафавана на 10 рублёў. Да іншых парушальнікаў правіл вулічнага руху прыменены розныя меры спагнання.

Пешаходы павінны добра разбірацца ў сігналах светафора, міліцыянера-рэгуліроўшчыка, разумець сігналы вадзіцеля, умець вызначыць момант бяспекі пераходу. Неасцярожнасць, няўважлівасць пешаходаў—прычына няшчасных выпадкаў — раненняў, а часам і гібелі чалавека пад калёсамі аўтамашыны.

Жыццё патрабуе, каб усе ўдзельнікі руху строгім чынам выконвалі правілы бяспекі руху. Толькі пры такіх умовах на нашых вуліцах і дарогах не будзе няшчасных выпадкаў.

А. НІЗОЎКІН,
інструктар ГАІ УВД Мінгарвыканкома.

М. АЛІСІЁНАК,
ст. дзяржінспектар Кастрычніцкага РАУС.

ВЯЧЭРНІ МІНСК. Фотаэцюд Л. ПЕРАСЫПКІНАЙ.

АГЛЯД-КОНКУРС

НА ЛЕПШАГА РАСПАЎСЮДЖВАЛЬНІКА «ЧЫРВОНАЙ ЗМЕНЫ»

Дарагі таварыш чытач! З першага верасня пачалася падпіска на «Чырвоную змену» — старэйшую рэспубліканскую маладзёжную газету, якая сёлета адзначыла свой залаты юбілей.

З мэтай больш шырокай прапаганды газеты, больш цеснай сувязі з чытачамі і паспяховага правядзення падпіскі на «Чырвоную змену» на 1972 год мы аб'яўляем наш традыцыйны конкурс на лепшага распаўсюджвальніка і прапагандыста нашай газеты.

Умовы агляду-конкурсу прадугледжваюць, што пераможцамі будуць названы ўсе, хто даб'ецца вышэйшай насычанасці падпіскі на «Чырвоную змену» на тысячу камсамольцаў, а таксама рэзкага павелічэння колькасці падпісчыкаў «Чырвонкі» ў пярвічных камсамольскіх арганізацыях.

Лепшыя прапагандысты і распаўсюджвальнікі нашай газеты — удзельнікі конкурсу будуць адзначаны ўзнагародамі: ганаровымі граматамі рэдакцыі, гадзіннікамі, фотаапаратамі, бібліятэчкамі мастацкай літаратуры і іншымі каштоўнымі прызамі.

Вынікі агляду-конкурсу з пералікам пераможцаў будуць надрукаваны ў «Чырвонай змене» ў пачатку 1972 года.

Матэрыялы па агляду-конкурсу просім накіроўваць рэдакцыі газеты «Чырвоная змена» (г. Мінск, Ленінскі праспект, 77, 4-ы паверх) і Упраўленню па распаўсюджванню друку Міністэрства сувязі БССР (г. Мінск, Ленінскі праспект, 10).

Апошні тэрмін прадстаўлення матэрыялаў 31 снежня 1971 года (па паштоваму штэмпелю).

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т—22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

АТ 15244

Заказ 1377.